Год дзве тысячы другі. Выбраныя старонкі з дзённіка

Нил Семёнович Гилевич

SHOUT
SHARE
IT

- Ніл Гілевіч

Ніл Гілевіч
Год дзве тысячы другі. Выбраныя старонкі з дзённіка

4-га студзеня. Хадзіў на сход у Дом ветэранаў, атрымаў прэмію імя А. Майсені (па “Народнай волі”). Быў у зале і выпушчаны з турмы А. Клімаў, якога зала вітала як нацыянальнага героя, хоць я так і не ведаю: за што? Што зрабіў для беларускай ідэі? Нешта тут ад міфалогіі.

5-га студзеня. Крукам, дзень і ноч, сядзеў над артыкулам пра драматургію Янкі Купалы, пачаты яшчэ ў снежні. Здаецца нешта атрымалася, удалося зрабіць некаторыя важныя акцэнты, асабліва пры разглядзе “Гнязда”.

7-га студзеня. Цэлы дзень перастукваў на машынцы артыкул (учора таксама). І такі дабіў, хоць позна вечарам. Гэта ўжо, можа, дзесяты мой артыкул пра Купалу, — калі лічыць і невялікія газетныя (публіцыстычныя).

11-га студзеня. Заходзіў Конан. Паабедалі, пагутарылі. Паказаў яму папку з рукапісамі (чарнавікамі) “Лысай гары” — ён першы, хто пабачыў гэтыя паперы. Наконт аўтарства ў яго сумненняў не было і раней — неаднойчы мне намякаў пра гэта.

20-га студзеня. Хадзіў глядзець Арсенеў фільм пра Тарашкевіча ў кінатэатр “Змена” — спецыяльны паказ у сувязі з юбілеем. Быў і Арсень. Фільм выдатны. Давялося ўзяць слова і сказаць усё тое ж: што рабілі і зрабілі “ворагі беларушчыны” з намі. І што працягваюць рабіць!.. Якая малайчына Н.М. Макрыцкая, што арганізавала ў сваім кінатэатры такі кіналекторый!..

21-га студзеня. Дачытаў (дагартаў, дакладней) адну здаравенную таміну Я. Будзінаса “Дураки” (Вярцінскі ўсурычыў). Як я не памыляўся ў яе аўтары — гэтым чужым для беларускай культуры чалавеку! Якая хватка! Які цынізм! Вось дзеля чаго ім патрэбна “дэмакратыя”.

22-га студзеня. Званіла з Таргуноў старая настаўніца Вера Васільеўна Малько. Прачытала маю “Ведзьму”, плакала, чытаючы,

ну і вось патэлефанавала… Першы водгук на публікацыю (можа, і апошні? Ніхто ж п’ес не чытае).

Закончыў і перадрукаваў прадмоўку да кнігі “Шчыра як на духу”. Апраўдваю задуму выдання, а ці не правалімся мы (“Кніга”) з ёю?

29-га студзеня. Заходзіў брат майго сябра часоў акупацыі Лёні Кулакоўскага — Георгі. Вельмі падобны на Лёню. Божа, колькі ўскалыхнулася ў памяці, на дне душы! Якое вялікае маё няшчасце, што Лёня апынуўся за межамі Беларусі, — як аказалася — назаўсёды. Які быў бы, адчуваю, мне на ўсё жыццё сябар — не з пісьменнікаў, а проста з людзей, з тэхнароў, у прыватнасці (Лёня — інжынер-сталеліцейшчык, — якая прафесія!).

31-га студзеня. Быў на незвычайным вечары ў Музеі Купалы — на прэзентацыі кнігі пра замучаных рэпрэсіяваных у Сібіры беларусаў. Не хапае душы ўсё гэта вытрываць.

1-га лютага. Хадзіў на выставу трох мастакоў Ціхановічаў — дзеда, бацькі і ўнука. Бацька і ўнук — таксама таленавітыя мастакі — пакінулі гэты свет, а дзед (90 гадоў) — яшчэ трымаецца. І трымайцеся, Яўген Мікалаевіч! Трымайцеся! Ваша пазіцыя, Ваша слова — і сёння падтрымка маладых, — маральная, духоўная, чалавечая.

6-га лютага. “Народная воля” змясціла вершы “Дарагія мае грамадзяне”, “Мастак”, “Памяці Куліка”. Пазванілі: Ліс, Марачкін, Сіўчык, Жуковіч і іншыя. Адзін з іншых сказаў: “усе вершаванае сёння на фоне тваіх — г….”.

10-га сакавіка. Сход дэмакратычнай інтэлігенцыі ў Палацы мастацтва наконт Гімна РБ. Браў слова, расказаў, чаму не быў прыняты Гімн у 1991–1994. Прагаласаваў за “Магутны Божа”.

4-га красавіка. Сустрэча на геафаку БДУ. Атрымаў ад зямлячкі кнігі Я. Гладкага. Быў на вечары Смольскага, у філармоніі. Маэстра высокага класа!

6-га красавіка. Хадзіў на выставу Марачкіна і “Пагоні”. Шмат цікавага. Хлопцы працуюць таленавіта і — у належным кірунку.

9-га красавіка. Да паўдня сядзеў у Нацыянальнай Бібліятэцы, гартаў часопісы часоў акупацыі. Пасля абеду — у мастака В.К. Барабанцава, пачаў маляваць (пісаць!) мой партрэт.

23-га красавіка. Быў у Салігорску, з У. Лапцёнкам. Прадавалі мае кнігі. Чытаў школьнікам вершы. І ў ДК. Звычайна, трафарэтна. Без энтузіязму. Гняце людская апатыя. Кніг купілі мала. Няма грошай — у тых, хто кнігу любіць і хацеў бы купіць. Прыходзіла на сустрэчу М.І. Мацюкевіч з дзяўчынкай — вялікая і мужная патрыётка. Не зламалася і пасля смерці сына (забілі бандзюкі).

24-га красавіка. Хадзіў у філармонію на вечар І.М. Шумілінай. Непераўзыдзеная ў нас піяністка. Назад вяртаўся з У. Конанам. Паплакаліся, папракліналі.

26-га красавіка. З Лапцёнкавымі дзяўкамі — у Віцебску. Дзве вялікія сустрэчы: ва ўніверсітэце (адкрываў і вёў рэктар А.У. Русецкі) і ў Доме культуры. Вельмі шмат прадалі маіх кніг. Было безліч пытанняў, у тым ліку вострых. Усіх надзвычай хвалюе лёс Беларусі і беларускай мовы. Арганізатар сустрэч — нястомны І.А. Навумчык. Да прыезду ў абласной бібліятэцы — выстава маіх кніг. Усё было не фармальна, не дзеля “птушачкі”; у Віцебску сапраўды чакалі (як абяцаў Навумчык).

6-га траўня. Вечарам — на прыёме ў пасла Турцыі Шуле Соймал; яна ад’язджае, развітальны (грандыёзны!) банкет. Шкада, што не будзе такога сімпатычнага Пасла.

7-га траўня. З раніцы — у Скарынаўскім Цэнтры. Круглы стол “Дзяржава і культура”. Мала пачуў радаснага. Або “дзяжурнае”. афіцыйнае, або — баязлівае. Пабыў да абеду.

15-га траўня. Пасля абеду — у Нацыянальнай Бібліятэцы. Гартаю беларускія часопісы 1942–1944 гадоў: “Беларуская школа” (па якім я вучыўся), “Жыве Беларусь”, “Беларус на варце”, “Новы шлях”. Неймаверна цікава! Раблю шмат выпісак — у разліку на скарыстанне ў публіцыстычных артыкулах.

17-га траўня. Шаўчэнкаўскі вечар у Музеі Коласа (у двары пад дожджыкам). Гаварыў і прачытаў вершык пра Кабзара. Быў пасол Украіны А.А. Дронь — слаўны чалавек, сябар Беларусі, вялікі патрыёт, сапраўдны сын Бацькаўшчыны. Як выдатна ён разумее нашу беларускую сітуацыю! І колькі зрабіў для ўмацавання нашай дружбы! Як непадобны на яго нашы амбасадары (у бальшыні сваёй)!

18-га траўня. Ездзіў у Ліду (з дзяўкамі Лапцёнка) прапагандаваць выданні “Кнігі”. Трохі лепш, чым было ў Салігорску, але зноў жа — трафарэтна і… нават не ведаю, як сказаць. Свята не было — ні для мяне, ні для прысутных. Бо “прысутныя” — прыгнаныя ў залу навучэнцы нейкага ПТВ. Як раней прыганялі роты дзве-тры салдат (з іх палавіна — нацмены і беларускай — ні бе-моль). Ну, а як іначай? Свабодны вечар паэзіі па аб’яве? Прыйдзе 10–15 чалавек — як было летась у Зэльве. Была такая ганьба — што хоць засілься.

16-га чэрвеня. Быў, па запрашэнні (па вялікай просьбе!), на Сойме Маладога Фронту. Вядома ж, папрасілі выступіць. Сказаў пра самае істотнае — што ўсе надзеі на моладзь. І прачытаў “Кліч да беларускай моладзі”. А моладзь — ёсць!

19-га чэрвеня. Прэзентацыя кнігі “Шчыра як на духу” ў бібліятэцы імя Купалы. Усе (і Законнікаў, і Кудравец, і Вярцінскі) добра гаварылі. І добра пасля пілі віно. Але браў слова і адзін спартсмен, шабліст, чэмпіён, удзельнік “Споведзі” — о, якой дыхнула імпершчынай! Адкрытай і нахабнай. “Пушкин превыше всех! Вы что же — не понимаете? Язык Пушкина изучает весь мир, а вы тут…” і г. д.

1-га ліпеня. Званілі з СП, запрашалі на свята ў гонар Купалы ў Вязынку — каб выступіў на эстраднай пляцоўцы. Не паеду. Каб не трапіць у пастку. Хоць і крыўдна — страшна!

17-га верасня. Хадзіў да рэктара БДУ А.У. Казуліна — прасіў аб вяртанні на кафедру філфака Н.І. Вырашыў у маёй прысутнасці — імгненна. А то дзякаваць Богу!..

21-га верасня. Ездзіў на магілу М. Матукоўскага, а пасля быў і ў яго хаце ў застоллі. Хораша пра яго гаварылі Бураўкін, Сухарукаў, Глебава (вельмі хораша!). Паўспамінаў трохі і я. Побач сядзеў І.М.Л. Усё ў той жа іпастасі — ні то патрыёт Беларусі і беларускай культуры, ні то халуй Масквы. Яшчэ “далазіў”, што я думаю пра Гэнага.

24-га верасня. Адбыўся XIV з’езд пісьменнікаў. Старшынёй выбралі А.Пашкевіча — не без маёй дапамогі (у сваім слове я заклікаў: даць лейцы маладым!). Выбары ішлі ў аўдыторыі, напалавіну п’янай, і вёў пасяджэнне п’яненькі У. П. У арганізацыйным плане З’езд зусім не падрыхтаваны — відаць, І-ва, ведаючы, што ёй нічога не свеціць, наўмысна самаўхілілася ад

падрыхтоўкі З’езда. Яна вельмі хацела, каб ён не адбыўся, каб застацца на пасадзе (як бы цяжка ні было). На маё здзіўленне — я атрымаў толькі 35 галасоў супроць (Быкаў і Барадулін — 59 і 62, Бураўкін — 43). 35 — гэта дробязь, гэта адных запраданцаў столькі было ў зале (да нават больш!).

Слова маё ўспрынялі так, як я і хацеў бы — усё зразумелі і засведчылі сваю салідарнасць, — і ў зале, і пасля ў кулуарах.

20-га кастрычніка. Колькі дзён таму быў на першым пасяджэнні Рады выдавецтва “Мастацкая літаратура”. Вельмі прасіў увайсці ў Раду дырэктар Мачульскі. Паразважыў — і даў згоду. На нейкі час. Калі толькі што-якое — калі будзе гнуцца не туды, — наша вам!..

30-га кастрычніка. Хадзіў на аргкамітэт па падрыхтоўцы Усебеларускага Сходу інтэлігенцыі, некалькі разоў браў слова ў спрэчках (усё яшчэ лезу, не ўгаманіўся). Быць адным з дакладчыкаў — як ужо размеркавалі, — адмовіўся. Не выцягну. Так і сказаў: не выцягну. Выдыхся да астатку.

Сказаў Б-ну, што пра мяне (якую няпраўду) нясе па “Свабодзе” Быкаў, — зрабіў выгляд, што нічога не чуў, не ведае. А няпраўды, вельмі крыўднай для мяне, абразлівай, — шмат: і Адамовіча я выгнаў з Беларусі, і супроць утварэння БНФ выступіў (заадно з Краўчанкам), і ад сораму за Закон аб мовах галаву апускаў (побач з Дземянцеем!) і сёе-тое яшчэ. Ах, Васіль, Васіль! Як жа ты паблытаў аднойчы мяне з некім! Як жа гэта сталася?!

31-га кастрычніка. Быў і браў слова на адкрыцці выставы Я. Драздовіча. Атрымаў яго альбом — цудоўнае, шыкоўнае выданне. (Марачкін уручыў — у аддзяку за эпіграф з Н.Г., якім адкрываецца кніга.)

Пасля там жа, у Музеі, цэлую гадзіну разглядаў экспазіцыю прац знакамітага фотамайстра 20-х гадоў Льва Дашкевіча. Дзяўчаты паабяцалі зрабіць для мяне адбітак здымка “Палац Тышкевічаў у Лагойску”. Цудоўныя здымкі! Які заслужаны перад беларускай культурай чалавек — і як мала ў нас пра яго ведаюць!

12-га лістапада. Быў на прэзентацыі Першага нумара “Дзеяслова”, у якім — і мае лірычныя мініяцюры. Выдатны часопіс пачалі рабіць хлопцы (Пятровіч, Акулін, Пашкевіч — рэдактары). На сучасным еўрапейскім узроўні. Дай Бог, каб нішто не перашкодзіла зрабіць яго стабільным выданнем. Між іншым, Пятровіч (галоўны рэдактар) папрасіў, каб я “Дзеяслову” прапанаваў сваю кнігу “Між роспаччу і надзеяй” (прачытаў у

“Новым часе” ўрывачак — і яму спадабалася). Даць я не супроць — але кнігу трэба напісаць, пакуль што ёсць адна трэць, старонак 150. Гэта цяпер мой найвялікі клопат. Матэрыялу (і думак) накапіў на 1500 старонак. Ды ўсё не засяду, каб шрайбаваць далей.

13-га лістапада. Хадзіў на аргкамітэт па арганізацыі і правядзенні юбілею “450 гадоў Рэфармацыі на Беларусі”. Каб я прыняў удзел — наўмысна заходзіў прасіць аб гэтым Сіўчык (дарэчы, добра з ім пагутарылі, вельмі сімпатычны мне чалавек). На пасяджэнні я выказаў прапанову падаць Рэфармацыю як мага шырэй у гістарычна-культурным і асветніцкім плане, а не ў канфесійным. І сказаў, што ідэя юбілею будзе прынята неадназначна, — і гэта трэба мець на ўвазе. Філарэтаўцы, напэўна, устануць на дыбы. Трэба шмат гаварыць пра значэнне Рэфармацыі ў друку.

14-га лістапада. Праз усе “не магу” схадзіў на сустрэчу ў каледж паліграфістаў (быў і Э. Акулін). Застаўся непрыемны асадак: на ўзроўні 60-х гадоў была ўся методыка, увесь сцэнар сустрэчы. Усё тая ж недарэчная завядзёнка — карміць госця-паэта ягонымі вершамі (ды хоць бы вывучылі!) і рэфератамі пра творчасць Купалы (у гэтым разе Купалы, бо — да яго юбілею прыўрочана). Ах ці, Божа мой! Дзе ж мы так далучым моладзь да паэзіі?

23-га лістапада. Хадзілі з Нінай на юбілейны абед да суседкі Наталлі Сямёнаўны — ёй споўнілася 80. Якая мужная жанчына, як трымаецца пасля таго, што перанесла! Успаміналі, канечне ж, і Валодзю, 26-га — яго дзень народзін.

26-га лістапада. Вечар маладых паэтаў і бардаў у вялікай зале ДЛ. Уважыў Янку Лайкова, які надта ж прасіў, каб я адкрыў сваім словам сустрэчу, — і пайшоў. І быў пакараны. Гэта было зусім не тое, на што я разлічваў. Невыноснае для мяне трэньканне хлапчукоў і дзявошак на гітарах. Паэзіі не пачуў ні радка. А ў зале — чалавек 30–40, не больш. А я так сур’ёзна рыхтаваўся. Да канца не дабыў, дзесь у сярэдзіне, пасля таго, як выступілі з прывітаннямі Пісьмянкоў, Дранько-Майсюк, Гальпяровіч, — пайшоў дадому. Ёсць праблема! — як у гэтакім разе кажуць. Запанавалі прымітыў, убоства, графаманія.

27-га лістапада. Ну, чакаем вялікага грому. Ці вялікага паскудства і гадства. Але так мне гэта не пройдзе — гэтыя вершы

ў сённяшняй “Народнай волі”. Вечарам зайшоў Сяргей: “Тата, Табе такога не “даруюць!” Як мог — супакоіў.

28-га лістапада. Прыехалі з Украіны: Р. Лубкіўскі, П. Засенка, М. Наенка, Ю. Заўгародні і А. Мамчыч (маладая паэтка). Арганізаваў гэта пасол А. Дронь — выдатны дзяржаўны муж, высокага рангу інтэлігент, і проста слаўны чалавек. Вечарам быў у яго ў гасцях — з гэтае нагоды. Былі таксама: Бураўкін, Законнікаў, Пашкевіч. Лубкіўскі прывёз вялізны том Багдановіча ў сваіх цудоўных перакладах, у бліскучым афармленні, — так хораша наш Максім яшчэ нідзе не выдаваўся, нават і на Радзіме. Вось што значыць любоў і павага!..

29-га лістапада. Дзень нашай нацыянальнай ганьбы. На сустрэчу з украінскімі паэтамі і пісьменнікамі ў БДУ (у БДУ! на філфаку!) прывялі (загналі) 30 студэнтаў і адну выкладчыцу. Гэта — днём. А вечарам, у ДЛ, на галоўнай святочнай падзеі, народу было паўзалы, у тым ліку… можа, два-тры пісьменнікі (апрача кіраўнікоў СП і запрошаных выступіць, г. зн. Бураўкіна, Законнікава і мяне). І ніводнага журналіста — ні з газет (нават з “ЛіМа”), ні з радыё, ні з тэле… На вялікім свяце братэрства літаратур і народаў! І мы хочам, каб нас паважалі. Быў і выступаў пасол Украіны, вялікай дзяржавы, а з боку гаспадароў — ні аднае афіцыйнай асобы!.. Больш пачварнага рэжыму і ўявіць нельга!..

30-га лістапада. Зранку быў на Вайсковых могліцах ускладалі кветкі Купалу і Коласу. Затым — у Вязынцы, дзе А.А.Дронь даў “прыём”, і мы развіталіся з украінскімі сябрамі (з Вязынкі яны падаліся прама на Кіеў — “рафікам” еўрапейскай вытворчасці, цудоўным мікрааўтобусам, якім і прыехалі ў Мінск). Кожнаму з гасцей падарыў сваю кнігу ці кніжыцу, перадаў і томік для Тамары Каламіец.

3-га снежня. Ну, дык не памыліўся, пачалося! У сённяшняй “Звяздзе”. У маёй яшчэ нядаўна любімай “Звяздзе”! Пачала Бондар. Як сука, што з ланцугу сарвалася. Не сумняваюся, што гэта толькі пачатак, толькі сігнал да атакі. “Звязда” не апублікаваць не магла (жывёльны страх паралізаваў), але хоць бы адным радком адмежавалася ад гэтай гнюснай брыдоты! Не! Пагадзілася з фашыстоўкай цалкам. “Атрымаў па заслугах. Так яму і трэба!” Ну, што ж, віншую! І дзякую.

5-га снежня. За тры дні — 3-га, 4-га і 5-га — толькі адзін чалавек, Алесь Траяноўскі, пазваніў, выказаў абурэнне і папрасіў не браць да сэрца “брудную пісаніну смярдзючай пачвары”. Раблю

выснову, што мае сябры “Звязду” не выпісваюць і не чытаюць.

6-га снежня. “НВ” змясціла рэдакцыйны артыкул у абарону Н.Г-ча. “Чытайце: пякучая праўда”. Артыкул моцны, пачвара атрымала па зубах як трэба. У нумары — і яе фашыстоўская вылазка, — каб чытачы пабачылі на свае вочы. Змешчаны яшчэ раз і мае вершы, якія трапілі не ў брыво, а ў вока.

З гэтае нагоды патэлефанавалі: чытачка Ір. Рыч, чытач Ал-др Ал-др., кампазітар Смольскі, мастак Вашчанка, Арсень Ліс і Ніна Мацяш. І ўсё… Болей ніхто не азваўся, не падтрымаў добрым словам, не асудзіў паскудніцу. Раблю выснову, што мае сябры і “Народную волю” не выпісваюць і не чытаюць.

9-га снежня. За апошнія тры дні пазванілі і падтрымалі мяне добрым словам Я. Мальчэўская (з Віцебска) і П. Місько.

Вечарам быў у Музеі Багдановіча — якраз Дзень Максіма. Запрасіў Э.Акулін, і я не сумняваўся, што вечарына прысвечана Вялікаму Паэту. Ашукаўся: сустрэча была прысвечана творчасці Эдуарда.

Дарэчы, ніхто з прысутных паэтаў (а былі і ўсе кіраўнікі СП, апрача Кудраўца) ні слова не сказаў мне наконт пасквіля Бондар у “Звяздзе”, ды і наконт водпаведзі ёй у “Народнай волі”. Як бы і не бачылі, і не чыталі. Не разумеюць, што публікацыя Пачвары — гэта пачатак таго страшнага, што ўжо аднойчы было ў Беларусі і кончылася 37-м? Ці, можа, яшчэ горш — думаюць: “а такі і варта, надта ж ужо… гэта самае!”? Ну, добра. Думайце, сябры, як знаеце. Але хто будзе наступны?

10-га снежня. Азваўся, нарэшце, і Янка Брыль. Пахваліў “абарончы” артыкул у “НВ”. Параіў мне плюнуць на пасквіль…

11-га снежня. Сёння раніцой памёр Грахоўскі. Званіў унук Андрэй з СП, прасіў дапамагчы знайсці каго з начальства, у СП ні душы няма. Я знайшоў Акуліна, усё яму растлумачыў, той паабяцаў тэрмінова адшукаць Пашкевіча. Пазваніў Маруку, папрасіў перадаць Мачульскаму (сам не здымае трубку — нарада, так патлумачыў Марук). Пазваніў на кватэру С.І., пагаварыў з дачкой Тацянай. Калі будзе пахаванне, яны яшчэ не рашылі.

12-га снежня. Днём больш трох гадзін праседзеў у “Кнізе” ў Лапцёнка. Быў і старшыня Таварыства Прыгодзіч. Трымалі справаздачу кіраўнікі абласных аддзяленняў. Карціна зусім бязрадасная, фактычна арганізацыя кнігалюбаў развальваецца і гіне. Больш-менш весялейшая сітуацыя на Віцебшчыне. На

Гомельшчыне засталіся дзве суполкі — Гомель і Мазыр. Тое ж і на Берасцейшчыне.

Усе ў адзін голас: няма беларускай кнігі! Наладзілі землякі свята паэзіі ў гонар Ан. Грачанікава — а ніводнай кнігі паэта на святе не было. А адкуль быць? Ужо гадоў дзесяць яго творы не выдаваліся. Між іншым, маглі б узяць на сябе гэты абавязак улады вобласці. Само Таварыства памагло выдаць кніжыцы паэзіі Т. Мельчанцы і Н. Шкляравай.

Прапаганда беларускай кнігі сіламі дзяржавы нідзе не вядзецца. Зусім і ніяк! А рускіх (расійскіх) кніг усюды навалам, і рэклама на кожным кроку. Гэта і зразумела: гаспадар кнігарні мае расійскай літаратуры на сотні мільёнаў рублёў, і яе трэба прадаць. Дык яна і рэкламуецца. А беларускіх кніг у яго — на 6 %, гэта ў лепшым выпадку. Дык і ліха з імі! Ці хто купіць ці не купіць — такой бяды, адзін працэнт пагоды не робіць (калі і гэты “адзін” ёсць — што сумнеўна).

У час пасяджэння зайшлі два агенты нейкай дзяржаўнай фірмы па распаўсюджанні расійскіх ілюстрацыйных часопісаў — два беларускія хлопцы, якія такім чынам зарабляюць грошы, у спадзяванні “скалаціць капітал” (што натуральна). Пакінулі ўзоры гэтых глянцавых размазюканых выданняў: “Разгадай” і “Сделай паузу”. Такіх расейскіх выданняў — сотні, і завозяцца яны ў Беларусь мільёнамі экземпляраў. Тысячы кіёскаў і кнігарань забіты расейскай прадукцыяй, забіта, завалена ўся Беларусь! Не прадыхнуць! Пад гэтым навалам гіне беларуская душа, а значыць і сама Беларусь. Вось што значыць — антыбеларускі, антынацыянальны рэжым! Вось што значыць — нянавісць да “беларушчыны” ў душах кіраўнікоў краіны! Вось што значыць — рабска-халуйская прырода і парода тых, хто захапіў у Беларусі ўладу!..

У справаздачах прыводзіліся прыклады: маці адцягваюць у кнігарні малых ад беларускай дзіцячай кнігі, злосна прыгаворваючы: “Это на белорусской! Не надо!” Як і трыццаць гадоў назад. Нічога не змянілася! Нават яшчэ горш.

У 16.00 ужо быў у бібліятэцы імя Пушкіна — на сустрэчы з пісьменнікамі Берасцейшчыны (у рамках “Дзён Брэсцкай вобласці ў Мінску). Прыехалі: Н. Мацяш, А. Каско, З. Дудзюк, А. Мазько, Ярына Дашына і інш., былі мінскія берасцейцы Р. Баравікова, Л. Дранько-Майсюк, У. Марук, В. Гардзей, яшчэ — У. Ягоўдзік. І чалавек 15 бібліятэкараў, усяго — чалавек 30. Вось такі “вялікі” літаратурны вечар, так сталічныя пабрацімы ўважылі і пашанавалі сваіх гасцей “берасцейцаў”. Браў слова і на вечарыне і пасля ў застоллі. Асобна — тост за Ніну Мацяш. Хораша гаварылі і чыталі выдатныя вершы — госці. Несумненна, “берасцейскае вогнішча”

сёння самае яркае. Але — які ж рэзананс? Які водгук? Які след у культурным жыцці сталіцы? Сем пісьменнікаў прыехала — сем прыйшло, 6 землякоў, ды стары Ніл Гілевіч. А дзе ж вялікая зала? Дзе тэлебачанне і радыё? Дзе карэспандэнты газет, у прыватнасці "ЛіМа"? Ды на сустрэчу з адной Нінай Мацяш павінны былі прыйсці сотні чытачоў беларускай літаратуры! Патрыётаў Роднага Слова!.. Божа, які сорам! Якая ганьба!..

13 снежня. Пахаванне С.І. Грахоўскага. А паўдванаццатай купіў кветкі і пайшоў на жалобны мітынг. Народу сабралася небагата (чалавек 150?), з іх — дзесяткі два-тры пісьменнікаў. Адкрыў — Кудравец. Затым гаварылі: Брыль, Гілевіч, Бураўкін, Тарас, Пашкевіч. Хоць быў прастуджаны, паехаў і на могілкі, аб чым, відаць, пашкадую: сопляў і хрыпаты ў бронхах дабавілася. А заўтра ісці ў тэатр (не пайсці — немагчыма).

На пахаванні, апрача маладых кіраўнікоў СП, не бачыў ніводнага 25-35-45-гадовага пісьменніка. Прыйшлі адны дзяды — каму за 50, за 60, за 70, за 80. Факт, які пра многае гаворыць. У пару нашай маладосці было зусім-зусім іначай. Старых, г. зн. настаўнікаў, маладыя шанавалі, і развітвацца з імі было горка. Сённяшнім "маладым ваўкам" не тое, што не горка, ім проста — "да фені", "да лямпачкі", — як і творчасць дзядоў, так і іх смерць. У літаратуры сёння ёсць толькі яны — геніяльныя, несмяротныя, вечныя.

14-га снежня. Нягледзячы на прастуду, у тэатр "Беларускай драматургіі", на запрашэнне Анісенкі, усё-такі пайшоў, — бо ўжо запрашэнне паўторнае. Ды і хацелася паглядзець, што яны зрабілі з паэмы Купалы, — хоць і драматычнай, аднак жа надзвычай складанай для сцэнічнага ўвасаблення, бо — поўная сімволікі, алегарычных вобразаў такіх абстрактных катэгорый, як нараджэнне і смерць, як вясна і лета, як вясновыя і летнія святы… Спектакль вельмі відовішчны, маляўнічы, яркі, поўны маладой энергіі (часам аж залішняй), што моладзі (а ў зале былі пераважна старшакласнікі і гімназісты) асабліва падабаецца. Дарэчы, і ўсе выканаўцы роляў — зусім маладыя артысты, учарашнія выпускнікі ТМ Акадэміі. Энергія з іх аж прэ. Але ёсць і прычына для засмучэння — мова. Дакладней — вымаўленне. Тое, што і ва ўсіх тэатрах Беларусі. Вымаўленне — ніякае. Нават я (а многія строфы паэмы помню на памяць) не ўсё разумеў, што прамаўляецца на сцэне. А як жа — мінскія, гарадскія дзеці, школьнікі. Зрэшты, яны, па-мойму, у асноўным глядзелі, а не слухалі.

15-га снежня. Больш не магу — пара памірaць.

18-га снежня. “Народная воля” апублікавала тры лісты ў абарону Н.Г. ад грубага пасквілянцкага выпаду. Кліменценка сказала, што такія лісты ідуць у рэдакцыю патокам. Але ці будуць і яшчэ публікавацца — невядома. Ды такой бяды, калі не будуць! Важна, што ўжо народ сваё важкае слова сказаў. Асабліва значны момант падкрэсліў І. Лагуновіч: Бондар — гэта сучасны Бэндэ, з такіх лістоў-даносаў пачынаўся 1937 год. Важна і тое, што аўтары ўсіх трох лістоў — пажылыя людзі, удзельнікі Вялікай Айчыннай, а не зялёныя мітынгоўшчыкі ці хуліганы з “Зубра” — як бы сказала начальства. Маўляў: хто заступаецца, хто абараняе? Дык вось дудкі, панове! Ветэраны Вайны і працы сказалі сваё слова.

Нечаканы і прыемны падарунак: Сакрат Яновіч прыслаў сваю мемуарную кнігу “Не жаль пражытага”, з вельмі мілым подпісам. Кніга напісана рукой выдатнага майстра слова, гранічна шчыра, зусім даступна, часта — надзвычай дасціпна, яшчэ часцей — страшна балюча, горка, злосна, бязлітасна іранічна, роспачна, і ўсё гэта, апошняе, уваходзіла, калі чытаў, у маё сэрца. Прачытаў адным духам: за паўдня. Прынёс, сеў, разгарнуў і не падняўся, пакуль не прачытаў. Шкада, што “сюжэт” абарваўся на канцы 80-х. Думаю, апошняе дзесяцігоддзе было не менш цікавае ў жыццяпісу Сакрата. Можа, дапіша?

19-га снежня. Дні чатыры назад успомніў, што паабяцаў Пісьмянкову падборку балгарскага гумару і сатыры для рубрыкі “Класікі смяюцца”. Уткнуўся ў зборнік “Смешки и болежки”, і неспадзявана для сябе зачапіўся за адну “болежку” вокам і глуздом і — і пагнаў і пагнаў, на сёння ўжо эпіграм дваццаць гатова. Як бы знайшоў аддушыну ад чорных думак, ад беспрасветнай скрухі.

Прыкладна а паўтрэцяй, як і дамаўляліся, зайшла Н.М. Санько — з навагоднім падарункам: аж чатыры кнігі выдавецтва “Тэхналогія”, сярод якіх неацэнны том “150 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі”. Сапраўды, кнізе няма цаны. Што яны зрабілі, Санько і Саверчанка! І, вядома ж, Яўген Кулік, — асабліва, што датычыць афармлення (і не толькі!). І, вядома ж, Наталля Міхайлаўна Санько — і рэдактар, і карэктар, і стыліст, і макеціроўшчык… Пакуль што перагартаў толькі абегла, але магу пэўна сказаць, што здзейснены творчы і грамадзянскі подзвіг. Калі б гэту кнігу выдаць накладам 500 тысяч асобнікаў — каб у кожнай беларускай сям’і стала настольнай, — за адно дзесяцігоддзе ўсё насельніцтва Беларусі стала б нацыянальна свядомым і патрыятычным, і праблема нашага суверэнітэту і

незалежнасці была б вырашана назаўсёды. Вядома ж, гэтая Кніга працавала б на душу і свядомасць народа не адна, а ў сукупнасці з іншымі (іх, дзякаваць Богу, нямала), але яна была б галоўнаю, тою, што “вядзе рэй”, што цягне самы цяжкі плуг нашага нацыянальнага адраджэння. Як жа зрабіць гэта — як аддрукаваць і распаўсюдзіць 500 тысяч паасобнікаў?

20-га снежня. Прыйшла пошта з Балгарыі — газеты і лісты. У Сафіі, паведамляе Найдзен, выйшаў том-трыпціх: Купала, Колас, Багдановіч. Брава, сябры-браты балгары! Адбылася ўжо і прэзентацыя, як я зразумеў — досыць прадстаўнічая. Былі Рыма Германава і сын Давыдкава Яраслаў, апошні чытаў пераклады бацькі, што мяне кранула амаль да слёз. Дарагія, мілыя людзі!..

Апаўдні зайшоў В. Болтач, прынёс абяцаныя газеты з праўдай пра партызан Лагойшчыны (два нумары “Беларускай газеты”) і расказаў пра ўчарашні агульны сход Літфонда Беларусі. Як і было задумана, да кіраўніцтва Літфондам прыйшлі лукашэнкаўцы. Тое, што расказаў Болтач, а пасля брат Мікола (па тэлефоне), паставіла ўсе кропкі на сваё месца. Узяты магутны рэванш за з’езд. А галоўнае… галоўнае, што і выйсця няма: Літфонд даўно голы, ад “Іслачы” засталіся рожкі ды ножкі, ён даўно не дзейнічае, пустуе. Банда (іначай не назавеш) зрабіла сваю цёмную разбойную справу. Дзеля гэтага яна і прыбрала да рук Саюз пісьменнікаў, — з уласцівым ёй цынізмам і пагардай да беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Ну, а бедныя, няшчасныя капыловічы ды слаўковічы — ім абы хоць нейкая костка са стала, хоць абгрызеная.

Ну, што ж, праз колькі месяцаў гэтага СП, што здабыў перамогу на з’ездзе, не стане. Адбудзецца новы сход (кангрэс, з’езд), будзе выбрана новае кіраўніцтва, — хто не падзяляе ідэйныя пазіцыі і агульны палітычны курс Урада, — прэч, вон, каб і духу не смярдзела! Або — сядзіце і не шкніцеся!.. Дык хоць пуцёўку са скідкай атрымаеце ў Дом творчасці, калі, вядома, ён будзе наш.

21-га снежня. Прачытаў учарашні “ЛіМ”. Пра юбілей А. Васілевіч і У. Рубанава (было б 50 усяго). Добра напісаў пра А.С. Б. Бур’ян — справядліва. Усё-такі пісьменніца яна выдатная — і адметная. Чым? Інтэлігентнасцю, высакароднасцю таленту, а г. зн. сваёй чалавечай сутнасцю, “светлая Панна” ў нашай літаратуры, — сказаў Бур’ян. Правільна. Святло, дабрыня, любоў — у аснове. Можна і так сказаць: паэзія. Яе проза вельмі паэтычная. Такія апавяданні, як “Мыс Добрай Надзеі”, — гэта ж паэма. Дый усе яе аўтабіяграфічныя аповесці. І эсэістычныя

нататкі.

У маштабнага пісьменніка вырастаў таленавіты Рубанаў. Некалі я падтрымаў яго добрым словам, — яшчэ пасля першага апавядання ў “ЛіМе”. Пісьменнік моцнай унутранай культуры думання і пісьма, уважлівы да стылю, прынцыпова строгі ў пошуках свайго слова, ды і мысляр цікавы, аб чым сведчаць апублікаваныя ў свой час яго афарызмы і дзённікавыя занатоўкі. І трэба ж! — на 42 годзе памёр, ды і з-за нейкай недарэчнасці, нібыта. Трэба будзе ўдакладніць у Масарэнкі.

22-га снежня. Каля 9 патэлефанаваў Алене Сямёнаўне — павіншаваў, пажадаў здароўя, падзякаваў. Падзякаваць ёсць за што. Хай Бог будзе міласэрны і дасць ёй “затрымацца” доўга-доўга.

Пазваніў і Масарэнку. Наконт смерці У. Рубанава ён сказаў: была п’янка, пілі “раял” (а гэта атрута), стала кепска, жонка не выклікала “хуткую” — і ўсё. “У труне, кажа, у яго былі чорныя пазногці”. Уладзіслаў быў траюрадным братам Алесю; Рубанаў — гэта прозвішча па маці (бацькава — Фурсан). Вельмі цікавыя дзённікі Уладзіслава, па словах Масарэнкі, могуць загінуць (дзесяць агульных сшыткаў). Капаўся ў іх Асташонак, хваліўся, што шмат чаго ў іх павыкрэсліваў… Калі гэта праўда — то чорт ведае што робіцца! Крэсліць у чужых дзённіках?

23-га снежня. Напісаў лісты ў Балгарыю і Сакрату ў Крынкі, папраўдзе, не лісты, а разгорнутыя навагоднія віншаванні. Балгарскіх сяброў трохі праінфармаваў пра літаратурную сітуацыю ў Беларусі і пра сваё незайздроснае становішча, — не стала дзе друкавацца, пачну пісаць у прыскрынак. Сакрату сказаў колькі добрых слоў пра яго кнігу “Не жаль пражытага”, ад якой і Ніна ў захапленні.

24-га снежня. Маладзечанскія хлопцы (М.Казлоўскі і А. Капуцкі) прывезлі наклад (100 асобнікаў) “Паланэза” Агінскага”. Дзесяць забралі сабе (7 падпісаў і 3 у запас), мне засталося каля 90, з якіх кніг 20 раздам (родным, сябрам, у бібліятэкі), а рэшту трэба неяк прадаць, каб хоць трохі вярнуць грошы. (Ніна была засмучана, як даведалася, што кніга выйшла за мой кошт, і я яе разумею: у нашым жабрацкім становішчы і такія выдаткі досыць адчувальныя.) Афармленне кнігі мне спадабалася, асабліва — вокладка, колер і малюнак. Партрэт размешчаны няўдала (я яго ўвогуле не планаваў, гэта “самавольства” Міхася). Шрыфт — трохі “цяжкаваты”, мог бы быць трохі святлейшы, рамачкі на старонках мне здаліся дарэчнымі, а Ніна палічыла іх лішнімі. Складзена

кніга добра, маю на ўвазе падбор вершаў, але некаторых — не далічыўся, аб чым шкадую. Калі б кніга выйшла ў канцы 2000-га — было б лепш, бо, за выняткам 15–20 вершаў, усё астатняе было ў трэцім томе. Там наклад — 3000, а тут — 100. Выданне сімвалічнае. Зрэшты, так яно і задумвалася. Мне хацелася, каб новыя вершы і менавіта гэтыя дзве паэмы выйшлі асобным выданнем — як чарговы зборнік паэзіі. А ўвогуле — сумна. Ну што такое сто паасобнікаў? Хто кнігу ўбачыць і прачытае? Нешта на гульню крыху падобна. Як малыя дзеці (і я ў тым ліку) рабілі кніжачкі ў адным экземпляры, і нават дроцікамі счэплівалі.

25-га снежня. Адправіў віншавальныя лісты Н. Мацяш, Д. Бічэль, Ю. Голубу, у якіх пастараўся і сёе-тое сказаць не святочнае. Тое, што магло б стаць прадметам гаворкі больш шырокай, бо з такімі людзьмі ёсць пра што гаварыць і ў імя чаго гаварыць. Рад быў бы (даўняе жаданне!) і напісаць колькі слоў пра кожнага з іх, але… агіднае, абрыдлае пытанне: а хто надрукуе? Я ж не абмяжуюся размовай толькі пра майстэрства, — ні ў якім разе!..

26-га снежня. Адшліфоўваў эпіграмы, напісаныя крыху раней, і новыя, — з разлікам на “Народную волю”. Добра было б і эпіграмы, і жарты, і іншыя сатырычныя мініяцюры (фрашкі?) выдаць асобнай кнігай. Іх у мяне не менш як дзвесце, а можа, і болей. Адкінуўшы, вядома, не лепшыя. Не сумняваюся, што чытач (пакупнік) знайшоўся б. Але — каму прапанаваць, хто выдасць? Лапцёнак ухапіўся б, кніга дала б прыбытак, дык жа дарога “завалена” Першым Томам Збору, — пакуль не ўбачу і не прыціснў да сэрца Яго — ні аб якім іншым выданні не можа быць гаворкі.

Купіў і пагартаў новы нумар “Архэ” — дзеля Канвіцкага. Але пачаў з артыкула рэдактара часопіса В. Булгакава — агляду і аналізу кніг пра беларускі нацыяналізм (Арлова, Дубаўца, Лыча, Родзькі, Лукашука, Ёрша… У Н. Г-ча, канечне ж, прац на гэту тэму няма). Затым прачытаў інтэрв’ю з А.Хадановічам і матэрыялы аб ім, — нумар прысвечаны яму, як новай зорцы ў беларускай паэзіі.

27-га снежня. Брылёўна, як мы ласкава завем яе дома, забрала ў мяне рукапіс Чацвёртага тома — нібыта для канчатковай падрыхтоўкі да здачы ў набор. Рукапіс ляжаў у выдавецтве восень і зіму, тады, як стала вядома, што том пераносіцца на 2003, я забраў яго, недзе ў красавіку, каб там не пыліўся. Ну вось, месяцаў дзевяць праляжаў у мяне, а сёння Наталля панесла яго зноў у выдавецтва. Выказала пры гэтым

нейкі аптымізм, але, але!.. Зусім не туды ўсё хіліцца, зусім не туды! Калі б прадаўся ці хаця б сядзеў моўчкі, “гніды падшчамя”, — дык быў бы і аптымізм, а затым і вынік.

Вярцінскі падсунуў мне нумар “Нёмана” з раманам А. Праханава — наўмысна, каб я прачытаў. Дык такі і прачытаў. Канцэптуальна, па ідэйна-эстэтычнай і палітычнай сутнасці — нічога новага для мяне не адкрылася. Усё тое, што я і мог чакаць. Хіба што смачна выпісаныя сцэнкі ўразілі, але ж гэта — дэталі. А ўвогуле — няшчасная, няшчасная Расея!.. А яшчэ горш няшчасныя мы!..

29-га снежня. Паэт з Берасцейшчыны Іван Лагвіновіч прыслаў мне два свае зборнікі вершаў — “Разлукі выраёвыя” і “Піліпаўка” (2000 і 2001; блаславілі ў свет — Пракаповіч Мікола і Алесь Каско, малайцы хлопцы, што заўважылі і падтрымалі гэтага таленавітага паэта). Лагвіновіч больш трыццаці гадоў ахвяраваў Данбасу, палавіну з іх, калі не болей, у падзямеллі, калоў вугалёк для Радзімы, нажыў цяжкую хваробу лёгкіх, у 50 гадоў выйшаў на пенсію і вярнуўся на Бацькаўшчыну, з 1992-га жыве ў Баранавічах. Вярнуўся паэтам — сталым, моцным, самабытным і — з добрай беларускай мовай (у Данбасе шмат друкаваўся на данбаса-рускай).

Лагвіновіч пытае парады, ці варта яму ўступаць у СБП. Сам я гатоў выйсці з гэтага СБП, але рэкамендацыю яму напішу, — пакуль у Саюзе ёсць Каско, Пракаповіч, Мацяш і… я, грэшны, — ён будзе з намі.

30-га снежня. Не зусім дарэчы, бо — пераднавагодняя мітусяніна, зайшлі з “рабочым пытаннем” Андрэй і Алена Лапцёнкі. Яны будуць складальнікамі зборніка паэзіі пра Беларусь, які мяркуецца выдаць у серыі “Народная бібліятэка”. Задума гэта належыць Лапцёнку-бацьку; я горача яе падтрымаў: абавязкова такую кнігу трэба выдаць, — кнігу, якая будзе істотна адрозніваца ад ранейшых (часоў СССР) тым, што не мецьме слядоў хваласпеву бальшавіцкай імперыі, што адлюструе самае шчырае і самае запаветнае слова беларускіх паэтаў пра сваю “краіну-браначку”. Натуральна, у ёй будуць прадстаўлены паэты новых пакаленняў і — што асабліва важна — паэты з беларускай дыяспары, паэты-эмігранты, слова якіх пра Беларусь раней на радзіме не гучала. Гэта я і сказаў сёння “на кансультацыі” ўкладальнікам будучай кнігі.

31-га снежня. Вось і завяршыўся 2002-гі — чорны, нядобры, неспрыяльны год. Нядобры і для маёй Радзімы, і для майго народ,

а значыць — і для мяне. Нічога, што хоць бы трохі ўсцешыла душу, ён не прынёс.

А што напісаў за год? Жменьку “танкаў” ды дзесятак публіцыстычных цыдул? У такім узросце, калі трэба даражыць кожным днём? На што ж я зблоціў 52 тыдні? Да таго ж і здароўе ссадзіў — у нейкую разваліну ператварыўся… І ад Новага — анічогачкі не чакаю. Анічагусенькі!..

* * *

Завяршыўся 2002-і — завяршыўся і дзённік майго жыцця. Больш запісаў не раблю. Не бачу сэнсу. Каб нехта некалі зразумеў, у які час я жыў і як лёс са мной і з намі абыходзіўся, — дастаткова таго, што напісана: і ў дзённіку, і ў артыкулах, і ў вершах…

Бывай, мой самы шчыры суразмоўца! Сказаць “да сустрэчы”, на жаль, не магу. Бывай!

Ніл Гілевіч